

ВЕДАМАСНЫ АРХІЎ 9



МУЖЧЫНСКІЯ «РЭТРАДЭТАЛІ» СПАРТЫЎНАГА СТЫЛЮ 12

27 МАЯ 2023 г.
СУБОТА
№ 100 (29980)

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Прадметны дыялог

## «ВЫ — НАША БУДУЧЫНЯ»

### Аб чым Наталля КАЧАНАВА размаўляла з навучэнцамі Полацкага кадэцкага вучылішча

**Прывітаўшы сваіх землякоў і не толькі ў Савеце Рэспублікі, спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што ўзаемадзеянне парламентарыяў з моладдзю адбываецца на рэгулярнай аснове. Па яе словах, дзверы Савета Рэспублікі заўсёды адчынены для падрастаючага пакалення. Аб гэтым сведчыць і нядаўняя сустрэча Наталлі Качанавай з удзельнікамі беларуска-расійскай маладзёжнай школы «Погляд у будучыню Саюзнай дзяржавы».**



Фота БелТА.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што для парламентарыяў работа з моладдзю вельмі важная. «Як і ў цэлым у краіне, — удакладніла яна. — Маладзежная палітыка — адзін з прыярытэтных кірункаў сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы. У нас сацыяльна-арыентаваная дзяржава, і ў аснове ўсяго — людзі. З іх пытаннямі, праблемамі».

Па словах спікера верхняй палаты парламента, сёння ў краіне робіцца ўсё для таго, каб людзі, якія жывуць на беларускай зямлі (Беларусь стала домам для прадстаўнікоў многіх нацыянальнасцяў), ні ў чым не мелі патрэбу. «Асноўная наша задача — развіваць краіну так, каб людзям было камфортна, каб пытанні, якія іх хвалююць, вырашаліся аператыўна», — акцэнтавала ўвагу спікер.

Даведаўшыся аб тым, што, перш чым пабываць у Савеце Рэспублікі, хлопцы і дзяўчаты наведалі дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь», Наталля Качанава патлумачыла, чаму важна захоўваць гістарычную праўду і наколькі важна памятаць аб нашых земляках, якія не дачакаліся Перамогі. «Трэба зрабіць усё, каб не дапусціць таго, каб на нашай зямлі зноў быў пажар, — гэта самае страшнае, што можа быць, — звярнула ўвагу моладзі спікер. — Вы павінны разумець: сёння захаваць мір і спакой у нашай краіне — задача не толькі для органаў улады. Гэта наша агульная задача, і вас у тым ліку. Калі наша грамадства будзе кансалідавана, калі мы будзем адзінымі, пераадолець гэтыя пагрозы і выклікі будзе нашмат прасцей. Улада робіць усё, каб не дапусціць баявых дзеянняў у нашай краіне. Наша палітыка заўсёды была міралюбівай. Мы за мір, супрацоўніцтва, за сяброўства з усімі нашымі суседзямі».

Асаблівую ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі звярнула на інфармацыйную бяспеку і параіла кадэтам умець аддзяляць праўду ад фэйкаў. «З аднаго боку, інтэрнэт — гэта добра, а з іншага — зло, якое нясуць не толькі ў наша грамадства, але і ў цэлы свет. Атрымліваючы няпраўдзівую інфармацыю (а мы бачылі, як лёгка моладзь паддаецца на ўсялякага роду заклікі), некаторыя паступаюць няправільна». Наталля Качанава параіла маладым людзям у гэтай вялізнай плыні інфармацыі пачуць голас педагога, які заўсёды падкажа, дапаможа разабрацца, што правільна, а што — не.

«Мне вельмі хочацца папярэдзіць вас усіх: будзьце ўважлівыя, — звярнулася спікер да навучэнцаў. — Сёння ты аступіўся — заўтра тваё жыццё можа быць перакрэслена».

Падчас дыскусіі (а атрымаўся цікавы і змястоўны дыялог) закраналіся і такія пытанні, як дэмаграфічная бяспека, статус і каштоўнасць сям'і, традыцыйныя каштоўнасці. «У нас ёсць традыцыйныя каштоўнасці, па якіх мы жывём і па якіх развіваецца наша краіна, — адзначыла Наталля Качанава. — Усё гэта трэба захаваць. Заўтра — гэта вы, заўтра — гэта наша Беларусь, а вы — наша будучыня. Таму каму мы перададзім нашу краіну, хто будзе жыць у гэтай краіне і якой яна будзе, залежыць ад вас. Таму вы павінны зрабіць усё, каб не падвесці тыя старэйшыя пакаленні, якія адваявалі свабоду і незалежнасць. Такім людзям здраджваць нельга, як і тым, хто і пасля ваеннай разрухі, і пасля развалу Савецкага Саюза па крупіцах збіраў гэтую краіну. Сёння мы жывём у цудоўнай, чыстай, дагледжанай, прыгожай краіне, якой ганарымся. Трэба рабіць усё, каб развіваць яе далей, працаваць на стварэнне».

Многія з навучэнцаў Полацкага кадэцкага вучылішча плануюць паступаць ва ўстановы вышэйшага навучання сілавога профілю і прысвяціць сваё жыццё служэнню Радзіме. «Насіць пагоны — гэта вельмі ганарова і вельмі адказна: у любую хвіліну ты павінен стаць на абарону Айчыны, — лічыць Наталля Качанава. — Гэта выбар, варты патрыёта сваёй краіны, сапраўднага патрыёта, які абраў для сябе прафесію служыць Айчыне. Тым больш цяпер, калі мы бачым, што адбываецца ў свеце, калі ідзе геапалітычны падзел свету».

**Вераніка КАНЮТА.**



# КЛАСНЫЯ СЕМ «Я»

Фота БелТА.

**На гэтым здымку** — 11 клас сярэдняй школы ў аграгарадку Пагранічная Камянецкага раёна ў поўным саставе. Так, у гэтай вясковай школе ўсяго сем выпускнікоў, гэта адзін з самых малых сёлетніх выпускаў у Брэсцкай вобласці. Агульная колькасць вучняў у гэтай школе, якую нядаўна з базавай зрабілі сярэдняй, — 77 чалавек. Больш за палову з іх падвозяць на навучэнне з шасці навакольных вёсак.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, намеснік міністра прамысловасці:**

*«У няпростых санкцыйных умовах Мінпрам праводзіць вялікую работу па імпартазамяшчэнні ў частцы прамысловых лічбавых тэхналогій, а таксама фарміраванні доўгатэрміновага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з распрацоўшчыкамі і вытворцамі дружалюбных краін. Мы ўпэўненыя, што беларуская прамысловасць пераадолее бягучыя цяжкасці, рэалізуе планы лічбавай трансфармацыі, стане больш эфектыўнай, лічбавай і незалежнай».*

Адпачынак-2023

## РАСЦЕ ПОПЫТ НА ЎНУТРАНЫ ТУРЫЗМ

### Якія ідэі і напрамкі прапануюць?

**Апошнія тры гады ў нашай краіне набірае абароты ўнутраны турызм. У 2021 годзе колькасць беларусаў, якія сталі адкрываць для сябе новыя пункты і аб'екты ў Беларусі, павялічылася ўдвая і з той пары толькі працягвае расці. Пры гэтым індывідуальныя туры пераважаюць над арганізаванымі. А самымі папулярнымі катэгорыямі ў нашых суайчыннікаў з'яўляюцца санаторна-курортнае лячэнне, аграэкатурызм, такія віды актыўнага адпачынку, як байдарачныя сплавы і велапрабегі, а таксама экалагічныя сцежкі і экалагічны турызм. Што наведаць, калі турыстычная класіка Беларусі даўно вывучана? Упэўненыя, што наперадзе яшчэ шмат цікавага і атмасфернага чакае вас гэтым летам. Пра адметныя ідэі і новыя напрамкі расказалі спецыялісты.**



### З 5 да 11 чэрвеня — экскурсіі са зніжкамі або бясплатна

— Вялікая частка турыстаў, якія ў дапандэмійныя гады выязджалі за мяжу, цяпер падарожнічае ўнутры краіны. Мы робім усё магчымае, каб людзям было камфортна знаходзіць і інфармацыю, і аб'екты, куды можны паехаць як у тур выхаднога дня, так і на больш доўгі перыяд, — расказвае **дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Ірына ВАРАНОВІЧ.**

СТАР. 3

Духоўнасць

## ЦУДОЎНАЕ ВЯРТАННЕ

### Пра бездзежскае Евангелле, якое ў вайну ратавала людзей ад расстрэлу, было вывезена ў Германію, а цяпер зноў служыць вернікам

**Многія ведаюць цудоўную гісторыю выратавання жыхароў вёскі Ражкоўка Камянецкага раёна ў час вайны. Вяскоўцы ўжо стаялі каля расстрэльнай ямы, калі нямецкаму афіцэру з'явіўся вобраз Божай Маці, якая прасіла выратаваць людзей. Аказваецца, падобныя і не зусім, але гісторыі са шчаслівым канцом здараліся і ў іншых месцах, проста мы не пра ўсе з іх ведаем. Адну падчас нядаўняй камандзіроўкі давялося пачуць ад протаіерэя Генадзя ВОРАНА, настаяцеля храма вёскі Бездзеж.**



### Намоленае за чатыры стагоддзі месца

Але пра тое цудоўнае вызваленне, а таксама доўгае падарожжа бездзежскага Евангелля крыху пазней, а цяпер пра гісторыю храма. Бо яна надзвычай цікавая. А яшчэ айцец Генадзь — дасведчаны экскурсавод. Відаць, што скрупулёзна вывучаў мінулае царкоўнага жыцця вёскі, тутэйшых настаяцеляў і самой святыні. Вывучаў, паводле яго слоў, па кнігах, дакументах, інфармацыі ў сеціве, успамінах людзей.

— Наша Свята-Траецкая царква ўзведзена амаль 240 гадоў таму, налета плануем адзначыць круглую дату, — гаворыць святар. — Але храм не першы на гэтым месцы. Першая святыня з'явілася ў Бездзежы ў 1622 годзе, храм быў названы ў гонар прарока Божага Іллі. Падчас Паўночнай вайны са шведамі храм згарэў, дарэчы, амаль з усім сялом.

СТАР. 3

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Парламент Малдавіі пазбавіў імунітэту лідара фракцыі апазіцыйнай партыі «Шор»



Парламент Малдавіі ў пятніцу пазбавіў дэпутацкай недатыкальнасці лідара фракцыі апазіцыйнай партыі «Шор» Марыну Таўбер, якую пракуратура падазрае ў парушэннях пры фінансаванні партыі. «Праект рашэння аб пазбаўленні імунітэту дэпутата Марыны Таўбер ухвалены галасамі 59 дэпутатаў [са 101]», — абвясціў старшыня парламента Ігар Гросу на пасяджэнні, якое трансліруе прэс-служба заканадаўчага органа. Па даных выконваючага абавязкі генеральнага пракурора рэспублікі Ёна Мунцяна, супраць Таўбер заведзена дзве крымінальныя справы. Яе падазраюць у фальсіфікацыі фінансавых справаздач партыі, а таксама ў атрыманні сродкаў з незаконных крыніц на выбарах мэра горада Бельцы, у якіх Таўбер прымала ўдзел у 2021 годзе. Пасля перамогі ў першым туры выбараў яе адхілілі ад удзелу. Гэтае рашэнне выклікала абурэнне ў палітыкаў і экспертаў, якія лічаць, што Цэнтрвыбаркам прымаў рашэнне пад ціскам праеўрапейскай Партыі дзеяння і салідарнасці. Таўбер назвала заведзеныя супраць яе крымінальныя справы атакай улады на апазіцыю. Яна заявіла, што гатова супрацоўнічаць са следствам для аднаўлення справядлівасці.

ISSN 1990 - 763X

### Вучыч перавёў ВС Сербіі ў стан павышанай баявой гатоўнасці



Узброеныя сілы Сербіі ў адпаведнасці з загадам прэзідэнта рэспублікі і вярхоўнага галоўнакамандуючага Аляксандра Вучыча пераведзены ў стан павышанай баявой гатоўнасці. Пра гэта ў пятніцу паведаміла газета «Вечерње новости». Паводле інфармацыі выдання, прэзідэнт Сербіі выдаў загад узброеным сілам у тэрміновым парадку выйсці да адміністрацыйнай мяжы з Косавам і Метохіяй у сувязі з «гвалтам, які спецыяльная паліцыя [прэм'ера непрызнанага Косава] Альбіна Курці прымяняе супраць сербскага народа ў Звячане, Зубін-Патоку і Лепасавічы».

### Іран і Бельгія абмяняліся вязнямі



У пятніцу МЗС Амана паведаміў, што Брусель і Тэгеран дасягнулі пагаднення аб абмене зняволенымі дзякуючы пасрэдніцкім намаганням Маската. У ведамстве ўказалі, што вызваленыя асобы былі ў пятніцу дастаўлены з Ірана і Бруселя ў Маскат для наступнага вяртання ў свае краіны. У выніку Бельгія вызваліла затрыманага больш за два гады таму іранскага дыпламата Асадулу Асадзі, які быў прыгавораны на 20 гадоў пазбаўлення волі. Суд Бельгіі абвінаваціў яго ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта на тэрыторыі Францыі. У сваю чаргу Іран вызваліў прыгаворанага за шпіянаж да 40 гадоў турмы бельгійца Аліўе Вандэкастылу.

КОРАТКА

● **Прэзідэнт павіншаваў камандаванне, асабовы склад, ветэранаў органаў пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь са святам — Днём пагранічніка.**



● Сума падпісаных кантрактаў па выніках візіту ў Карэлію склала больш за $70 млн.

● **На другім энергаблоку БелАЭС пачалі выпрабаванні ў рэжыме поўнага абясточвання.**

● Расійскія металавытворцы маюць намер павялічыць долю біржавых продажаў у Беларусі.

● **Космас, мікраэлектроніка і праграмнае забеспячэнне будуць разам развіваць вучоныя Беларусі і РФ.**

● Прадпрыемствы «Беллеспаперапрама» ў І квартале нарасцілі экспарт у Грузію на 16 %.

Тэму падказаў чытач

## Жывая памяць,

### або Экалагічная альтэрнатыва пластыкавым кветкам

**«На Радаўніцу нашы людзі нясуць на магілкі сваякоў новыя штучныя букеты. А леташнія, выцвілыя ад сонца і брудныя ад пылу, выкідаюць за агароджу могілак, — патэлефанавала ў рэдакцыю Галіна Фёдараўна з Мінска. — Я раней таксама так рабіла, пакуль мае ўжо дарослыя дзеці не далі мне пачытаць артыкул пра шкоду, якую прыносяць прыродзе кветкі, зробленыя з таксічнага пластыку. Пасля гэтага я задумалася, што трэба мяняць свае звычкі, неяк па-іншаму, больш экалагічна, шанаваць памяць продкаў і ўпрыгожваць магілкі».**

### Чаму штучныя букеты шкодныя?

Як правіла, пялёсткі штучных кветак вырабляюць з сінтэтычных тканін і афарбоўваюць таксічнымі анілінавымі фарбамі. Сцяблінны робяць з нізкаякаснага пластыку. А сарцавіны і дробны дэкор — з пафарбаванага пенапласту, які пры награванні на сонцы выдзяляе канцэрагенны стырол. Такія букеты даволі хутка ператвараюцца ў адходы, якія ніяк не перапрацоўваюцца, бо ўтрымліваюць шмат складальнікаў, якія цяжка раздзяліць. **Таму толькі ўявіце: штогод пасля памінальных свят на могілках краіны збіраецца і вывозіцца на палігоны каля аднаго мільёна пластыкавых кветак.** Тэрмін іх раскладання — ад 100 да 500 гадоў. І ўвесь гэты час яны вылучаюць таксічныя рэчывы, забруджваючы глебу і грунтавыя воды. Спальваць жа штучныя букеты небяспечна, бо, згараючы, яны выдзяляюць у паветра цяжкія металы і дыяксіны, што негатыўна ўплывае на здароўе людзей.



***Мы вырашылі пашукаць, якія ўсё ж такі ёсць экаальтэрнатывы пластыкавым кветкам. Чым іх можна замяніць, каб упрыгожыць магілкі?***

СТАР. 4